

**Пэтра Дваржакава** (Petra Dvořáková) (нар. 1977) За дэбютную кнігу інтэрв’ю “Пераўвасобленыя мары” (Proměněné sny), якая выклікала вялікі розгалас у чэшскім каталіцкім касцёле і ў шырокай чытацкай аўдыторыі, у 2007 годзе атрымала літаратурную прэмію Magnesia Litera ў галіне публіцыстыкі. Адно з інтэрв’ю з гэтай кнігі друкавалася ў перакладзе на беларускую мову (пераклад Лізаветы Касмач) у часопісе “ARCHE” (№6, 2009). Новая аўтабіяграфічная кніга “Я – голад” (Já jsem hlad) расказвае пра драматычнае змаганне з анарэксіяй на фоне шырокай карціны прыватнага жыцця аўтаркі.

# Я – голад
(Ja jsen hlad)

Гісторыя пра змаганне з ментальнай анарэксіяй,
пра пошук, шлях і вяртанне да жаночай душы

*Фрагменты з кнігі*

<…>

## Знаёмыя пахі

---

***узрост*** **24 гады |** ***рост*** **168 см |** ***вага*** **51 кг**

Тады я зноў, праз колькі гадоў, наважылася напісаць Міхалу. Ён быў знаёмы з маім мужам і прыйшоў да нас у госці. Не здарылася нічога асаблівага, проста пасядзеў у нас хвілін дваццаць, мы пагаварылі пра сям’ю, пра будаўніцтва дому, і ён хутка пайшоў. Але менавіта тады настаў вырашальны момант, які ўва мне зноў распаліў прагу ягонай блізкасці. Калі я пайшла яго праводзіць і ўваходзіла з дзіцём на руках у ліфт, ён зусім лёгенька дакрануўся да маёй спіны. Быццам хацеў мяне падапхнуць да дзвярэй. Я адчула ягоны дотык. Мяккі, нязначны дотык рукі да спіны. У тое імгненне, у тым адзіным дотыку я зноў напоўніцу сутыкнулася з усёй ягонай бацькоўскай апекай і пяшчотай. У тым дотыку было сканцэнтравана ўсё, што я ад яго яшчэ напаўдзіцём атрымлівала, тое, чым ён мяне насычаў, цешыў і напаўняў. З той хвілі я інтэнсіўна прагла зноў быць з ім у кантакце.

Потым мы абмяняліся некалькімі лістамі і праз паўгода зноў сустрэліся, гэтым разам на самоце. Я магла быць больш нязмушанай, чым у прысутнасці мужа. Мы гаварылі пра тое, што за гады разлукі пražылі. Але нашмат важнейшым было тое, што я пачала адчуваць. Калі я ў канцы спаткання сыходзіла, мы падалі адно аднаму па-сяброўску рукі. І раптам спантанна абняліся. Ніколі да той пары мы гэтага не рабілі. Нават фармальна. Перад тым ён толькі часам дакранаўся да маёй рукі. І ягоныя словы:

“Адчуваю знаёмы пах”. Толькі пры гэтых словах я ўсвядоміла, як інтэнсіўна ён мусіў успрымаць мяне яшчэ з майго дзяцінства. Не ведаю, ці ўжо ў тое імгненне я была закаханая. У кожным разе я ў гэтым сабе не прызнавалася і нават не дазваляла сабе так думаць. Бо я ж была замужам і практычна да згаданага спаткання звярталася да яго на вы. Свае адчуванні я тлумачыла сабе як прагу ягонай блізкасці, падобную да той, якую зазнала некалі даўно. І я была перакананая, што калі ўсё гэта мае нейкі ўплыў на маё замуства, то толькі пазітыўны. Мы пачалі з Міхалам больш інтэнсіўна ліставацца, і гэтым стасункам я ўнутрана пачынала жыць. Зноў і зноў ува мне ажывала адчуванне тых абдымкаў. Гэта было надзвычай прыгожа, датуль я нічога падобнага не зазнала. Муж мне тады колькі разоў сказаў, што апошнім часам я змянілася, што я часта задуменная і мае думкі лунаюць недзе далёка. Аднойчы ён нават выказаў здагадку, што такою я стала пасля майго спаткання з Міхалам. Але я гэтага не прызнавала, а магчыма, я і сама перад сабой не хацела нечага такога дапусціць. У тым часе я чакала другое дзіця. Я была маці, якая жыла толькі дзеля сям’і і практычна не адыходзіла ад сына. Калі потым нарадзіўся другі хлопчык, я была шчаслівая. Пасля другіх родаў таксама насталі ўскладненні з плацэнтай. Гэтым разам яна не аддзялілася зусім, і доктар мусіў вырашыць праблему мануальна. З той аперацыі ў мяне трывала засела асаблівая карціна, якая пазней яшчэ шмат разоў паўставала ў мяне перад вачыма. Балела гэта яшчэ больш, чым самі роды. Я жахалася кожнага разу, калі доктар зноў мусіў дакрануцца да раны. Я ўцягвала жывот, а мае ногі, абапертыя на поручні, дзіка трэсліся. У тым болю і ў нейкім пасляродавым дурмане я глядзела, як доктар выдаляе плацэнту, а ягоная рука да самага локця была ў маёй крыві. Я адчувала асаблівае здзіўленне. Як такое магчыма, што яму зусім не агідна датыкацца да маёй крыві?

З Міхалам я зноў спаткалася ўлетку, праз колькі месяцаў пасля другіх родаў. Прыгадваю, як я змагалася са згрызотамі сумлення, што на дзве гадзіны пакідаю малое дзіця. Але я прагнула бачыць Міхала. Я хацела быць для яго прыгожай. Было спякотна, на мне была кароткая белая сукенка спартовага пакрою. Я нават згадваю, што ўжо купляла яе з прыхаванай думкаю пра яго. І менавіта тады ў нашым стасунку настаў пераломны момант. Той раз ён упершыню глядзеў на мяне як на дарослую жанчыну, і я зразумела, што ён мяне так і бачыць. З аднаго боку, мне было прыемна ягонае здзіўленне і зачараванне мной, з другога мяне бянтэжыла, што ён мяне хоча і так адкрыта гэта праяўляе. Мы пайшлі разам прагуляцца, сядзелі ў траве, размаўлялі і трымаліся за рукі. Ён хацеў, каб я села яму на калені. Я была здзіўленая і саромелася. Я не была звыклая з некім вось так датыкацца. Тым больш з мужчынам, які не быў маім мужам. Але ўрэшце мяне пераканала тое, што побач са мной сядзіць ён. *Ён*, хто заўжды быў для мяне

абсалютна чыстым чалавекам, аўтарытэтам. Бо ён нічога дрэннага не зрабіў бы! І ўсё адно я адчувала, што гэта было няправільна. Мяне мучылі згрызоты сумлення ў дачыненні да мужа і адначасова я іх задушвала. Я сама сябе пераконвала, што няма чаго перажываць. Бо гэта ж быў ён, Міхал. Той так добра знаёмы і блізкі чалавек.

Хоць паміж мной і мужам шэраг праблемаў быццам прыснуў, усё адно я адчувала, што я ўсё больш пакутую. Але галоўнае, я дазволіла сабе *прызнаць, што пакутую*. Я выразна ўбачыла, як адзінае спатканне з Міхалам мяне насыціла і як усё гэта кантраставала з маім жыццём з мужам. Я пачынала жыць у сваім уласным свеце. Раз за разам я натыкалася на мужаву пачуццёвую пляскатасць. Нешта не дазваляла яму ўступіць у мой свет, а ягонага мне было мала. Усе гэтыя праблемы адбываліся ўглыбі нашага стасунку і ў штодзённае жыццё траплялі хіба перыферыйна. Тыпова нашыя разыходжанні праяўляліся, прыкладам, у тым, якія ён мне купляў падарункі. Ён ведаў, што я вельмі люблю кнігі, але ні разу ніводнай мне не падараваў. Я прабачала яму, уважаючы гэта за мужчынскую таўстаскурасць. Ніводнага разу я яго гэтым не папракнула.

Прыблізна праз тры гады пасля першага разу паўтарылася біццё. У нас быў канфлікт, і ён вырашыў яго тым, што схапіў мяне за горла, штурхнуў да сцяны і закрычаў на мяне. Потым гэта здарылася яшчэ колькі разоў. Ён мяне біў, пінаў на сценку. Такое адбывалася перыядамі, некалькі разоў цягам паўгода. А потым два гады нічога. Галоўным чынам у складаных жыццёвых сітуацыях. Тады я паспрабавала з ім гэта спакойна абмеркаваць. Ён сказаў, што зусім не здольны сябе кантраляваць, пачуваецца бездапаможным і ў такія моманты адзіную магчымасць справіцца са мной бачыць у фізічнай сіле. Я зноў дала сабе зарок, што не смею дапускаць сітуацый, калі ў канфлікце перамагаю я, а яму здаецца, што ён прыціснутым да сцяны. Я зноў прыняла ўсё як сваю віну і памылку. Зноў крыху паднізіла свае патрабаванні і зноў усё супакоілася. Але мяне гэта і надалей турбавала.

Аднойчы я паспрабавала адкрыцца сваёй сястры, але без вялікага поспеху. Мне здалося, што яна не ўспрымае гэта сур'ёзна або нават адмаўляецца, не хоча мяне пачуць. Што яна зусім не разумее, якую важную рэч я ёй кажу. Адзіны чалавек, з якім я гэта абмяркоўвала, была мая сяброўка. Яна раіла мне сысці ад мужа. Сцвярджала, што гэта сапраўдны сямейны гвалт. Але гэтага, у сваю чаргу, не хацела чуць я. Я не верыла, што гэта можа быць *сапраўдны* сямейны гвалт, і такім чынам у сваім болю я заставалася адна і чым далей болей шукала выйсця ў стасунку з Міхалам. Я жыла з ім і дзеля яго, хай сабе толькі ў сваім нутры, думкі пра яго дапамагалі мне, сілкавалі мяне і падтрымлівалі. Я пачала з ім пераходзіць межы

сяброўства. Паміж намі даходзіла да пацалункаў, дробных інтымнасцяў, пазней да пешчання, і гэта не было мяжой. Я ўступала ў вялікую жыццёвую распалавіненасць. Я не хацела быць нявернай, для мяне гэта было недапушчальным. Кожны Міхалаў дотык я пост-фактум абдумвала, імкнулася сама сабе адказаць на пытанне, ці гэта *ўжо* была сапраўдная нявернасць або яшчэ не. У мяне былі пэўныя абмежаванні. Вялікую ролю для мяне граў ягоны аўтарытэт. Для яго гэта відавочна не было нявернасцю, і таму я сама сябе імкнулася пераканаць, што ён мае праўду. Але ў глыбі сэрца ў мяне не было спакою. Гэта было цудоўна і пакутліва адначасова. Я перажывала абсалютную пачуццёвую напоўненасць, як ніколі ні з кім у жыцці. Я пачувалася каханай, акурат так, як усё жыццё ўяўляла, наколькі чалавек можа быць каханым. І я была яму цалкам аддадзеная. І інтымнасць між намі расла, нягледзячы на тое, што мая распалавіненасць яе ўва мне фармавала спецыфічным чынам. Я прагнула цялеснага кантакту з ім і ў той жа час страшэнна перад ім саромелася. Я не была здольная паўстаць перад ім аголеная, я захіналася, як толькі было можна. Увесь час ува мне прысутнічалі ўсе складнікі майго асаблівага стаўлення да яго, я часта была ў дачыненні да яго хутчэй дачкой, чым каханкай. Я хацела быць з ім, але пры гэтым хавалася пад прасцінай. Калі ён мяне прасіў, каб я цалкам раздзелася, мне доўга трывала, пакуль я гэта зрабіла. Я страшэнна, страшэнна саромелася, калі ён хацеў глядзець…

І ўсё ж я пачувалася напоўненай, і гэта было для мяне істотным. Але гэта была напоўненасць па-за замуствам, знітаваная з маной і апраўданнямі. Вядома ж, гэта *была* нявернасць, хоць мы з Міхалам яшчэ не спалі. Тады я адназначна зразумела, што нявернасць у жанчыны ёсць перадусім справай сардэчнай, і што чалавек часам не мусіць да другога нават дакрануцца, і пры гэтым нявернасць здзейсніць. І ў меру сваёй нявернасці я безнадзейна аддалялася ад мужа.

Толькі праз доўгі час я наважылася адкрыцца сваёй сяброўцы, расказаўшы, што перажываю. Я была перакананая, што яна мяне зразумее. Яна ведала маю сітуацыю, ведала ўсё, што адбываецца паміж мной і маім мужам. І яна напраўду мяне зразумела. Тады я сутыкнулася ў яе з цудоўнай жаноцкасцю. І перажывала з ёй непаўторнае жаночае сяброўства. Улетку мы хадзілі з ёй разам купацца пры месяцовым святле ў ставе, голыя, мы сікалі ў ваду і з гэтага рагаталі. У маім жыцці яна была адзінай сапраўднай сяброўкай. Толькі яна ведала ўсю праўду пра маё жыццё.

*Dear Joss,*

*ты хочаш, каб я шчыра расказала табе абсалютна ўсё, але для мяне гэта няпроста. Пост-фактум я не разумею, як я магла перажыць тое пекла. І хоць мінула ўжо больш за пяць гадоў, як мой хлопчык захварэў, ува мне гэта па-ранейшаму вельмі жыва і інтэнсіўна. Даруй, што я гэтага пазбягаю і замест аповеду дасылаю табе артыкул, які я некалі напісала для аднаго вядомага часопіса. Я ведаю, што адстароненасць публіцыстыкі ёсць, уласна, уцёкамі ад паўторнага перажывання болю, у які я мусіла б зноў увайсці. У цябе яшчэ няма свайго дзіцяці, ту* dear, *і таму ты не можаш цалкам усё зразумець, але павер мне, што праз тую хваробу маё жыццё назаўжды раздзялілася на час* перад тым *і* пасля таго.

## “ЛЕЙКЕМІЯ? НЕ, ГУЛЬНЯ Ў КАСМАНАЎТА”

Я думала, што гэта будзе ўсяго толькі чарговы банальны вірус, з якім мой трохгадовы сын хутка справіцца. Але калі праз два тыдні стома не праходзіла, а вузлы павялічваліся, доктар паслаў нас у шпіталь. Падазрэнне на вострую лейкемію. Каб апісаць Вітэкаву гісторыю, я мусіла прапусціць добрыя сто грам. І ўсё адно яшчэ застаюцца моманты, якія і па прашэсці двух гадоў я баюся прыгадваць, нягледзячы на тое, што я і маё дзіця можам пакуль гаварыць пра ўдачу.

Тое, што Вітэк хворы, нам паведамілі жахлівым чынам. Доктарка задавала мне пытанні тыпу: “І вы не заўважылі, што ў яго павялічаная печань?” Дагэтуль не разумею іх імкнення адшукаць вінаватага. Я, вядома, была ў шоку, увесь час спадзявалася, што прачнуся і ўздыхну з палёгкай, што гэта быў толькі дурны сон. Ачомалася я толькі дзякуючы рацыянальнаму падыходу маёй сяброўкі. Ніякага прычытання, ніякіх слёз. Яна мне сказала, што выжыве Вітэк або памрэ, я проста павінная сціснуць зубы і ўсё вытрываць. І зрабіць усё дзеля таго, каб ён быў шчаслівы.

### *Пачатак*

Тады ж мы ўпершыню натыкнуліся на “асаблівасці” ў нашай сістэме аховы здароўя. Без якой бы там ні было кансультацыі з намі было вырашана, што Вітэка перавязуць у брненскі шпіталь. Перавозку ў пражскі “Мотал” я мусіла даслоўна выбіць. Дагэтуль не ведаю, у чым была праблема. Яны рабілі гвалт, свае довады доктарка аргументавала тым, што галоўны лекар будзе незадаволены.

З раённага шпіталя мы з’язджалі з перакананнем, што Вітэкаў стан мы занядбалі і ў яго мінімальныя шанцы на выжыванне. Хоць я ўжо пэўны час працавала ў медыцыне ў якасці медсястры, пра дзіцячую лейкемію я ведала прыблізна столькі ж, колькі звычайны прафан. Я меркавала, што вылечваецца працэнтаў пяць, максімальна дзесяць дзяцей.

Толькі пасля першых дзён у “Мотале” да мяне прыйшло разуменне, што з паміраннем не ўсё так адназначна. Адразу ж на прыёме нам доктар сказаў, што Вітэк знаходзіцца ў адносна добрым стане. Аналізам касцявога мозгу пацвердзілася лімфабластычная лейкемія. Калі доктарка нам паведаміла, што з такім тыпам лейкеміі вылечваецца да васьмідзесяці працэнтаў дзяцей, я была гатовая святкаваць перамогу. Вядома, яна нас папярэдзіла, што хіміятэрапія будзе няпростай, і не хавала, што ўскладненні апошняй могуць азначаць і смерць. Я не надта была здольная ўявіць, што прынясе з сабою лячэнне. Належна навучаная амерыканскімі фільмамі, я ўзгадала лысую галаву і ванітаванне штодзесяць хвілін, але на гэтым мае ўяўленні сапраўды скончыліся. Парадаксальна за ўвесь час лячэння Вітэк ванітаваў толькі двойчы.

***Верасень 2003***

Пачаўся марафон аналізаў і я зразумела, што адна з рэчаў, да якой буду вымушаная прывыкнуць, – гэта назіраць, як Вітэк пакутуе. Хоць я, былая аперацыйная медсястра, мела тую выгаду, што не млела пры выглядзе кожнай кроплі крыві, але бачыць страх і боль уласнага дзіцяці было жахліва. Калі Вітэк заўважыў, што ўколам няма канца, ён пачаў безупынна пытацца, што яму будуць рабіць.

Я не ведала, як яму патлумачыць, што гэтыя аперацыі цяпер з ім будуць праводзіць штодня яшчэ вельмі доўга. Добра хоць пры пункцыі касцянога мозгу яму давалі седатывы. Яны выклікалі ў яго прыпадкі смеху. У грудзіну яму быў увапхнуты тоўсты катэтар, Вітэк лупіў вочы і залівіста рагатаў. “Працверазеўшы”, ён нічога не памятаў.

Я яго ні ў чым не падманвала, але ў той жа час наперад нічога яму не расказвала. Я хацела матываваць яго да супрацоўніцтва і мне прыйшла да галавы вар’яцкая ідэя. Я сказала яму, што ў шпіталі яго трэніруюць на касманаўта. Гэтую выдумку я скарыстоўвала да ўсяго, што ў ягоным жыцці адбывалася. Ён надумаў, што ў яго будзе жоўтая ракета і скафандр. Крызіс

настаў прыблізна ў сярэдзіне курсу, калі ён мне сказаў, што больш не хоча быць касманаўтам і хоча вярнуцца дамоў.

Першыя дні на гематалогіі мяне бянтэжылі. Я назірала, як тыя лысыя дзеці там гуляюцца, катаюцца на штатывах для кропельніц, і акрамя тых лысых галоваў у іх нічога застрашальнага не было. У адрозненне ад майго ўяўлення пра белых схуднелых “напаўмерцвякоў”, яны здаваліся цалкам укормленымі і задаволенымі. На пару дзён я ўпала ў адваротную крайнасць, у ілюзію, што лячэнне мы перанясем лёгка, што хіміятэрапія – гэта не страшна.

***Голад, голад, голад***

Першая фаза тэрапіі палягала ў паглынанні мегадозаў картыкоідаў. Праз некалькі дзён мне стала зразумела, чаму дзеці ў аддзяленні такія ўкормленыя. Такога шалёнага апетыту я ў Вітэка ніколі не бачыла. Ён еў бесперастанку цэлыя дні. І пазней, калі мы ўжо былі дома і я запякала курыцу, ён стаяў ля духоўкі ўсе дзве гадзіны і назіраў за працэсам, быццам глядзеў свой улюбёны серыял. На абед ён з’ядаў курыцу цалкам. Некалькі разоў за ноч я падагравала яму сасіскі, варыла какаву або тушыла гародніну. Гэта стамляла, але калі ў чалавека ёсць адчуванне, што ён можа актыўна ўдзельнічаць у вырашэнні праблемы, то ў яго прынамсі з’яўляецца ілюзія, што пераносіць нягоды лягчэй. Ежа для Вітэка была невычэрпнай крыніцай радасці.

Наступным пабочным эфектам картыкоідаў была радыкальная змена вонкавага выгляду. Доктар папярэджваў мяне пра гэта, а зрэшты, я і сама паўсюль навокал магла бачыць, як Вітэк будзе налета выглядаць. У медыцыне гэта называецца месяцападобны твар. Самыя вялікія змены насталі адразу пасля першых дозаў. Яго немагчыма было пазнаць. Ягоныя вочы ператварыліся ў шчылінкі, заціснутыя велізарнымі шчокамі. Яму нарос гіганцкі жывот, але канцавіны засталіся худыя. Ён сядзеў на ложку з расцягнутымі нагамі, паміж імі звісаў жывот, і ён ледзь дыхаў. Валасы ў яго павыпадалі адразу ж цягам першага месяца. Аднойчы ён пабачыў сябе ў люстэрку і не пазнаў. Ён спалохаўся, плакаў і зноў а зноў хадзіў на сябе глядзець.

Наступныя аналізы паказалі адступленне хваробы, таму нас на пару дзён пусцілі са шпіталя. Гэтым разам уся сям’я напоўніцу акунулася ў новую сітуацыю. Я была вымушаная звольніцца з працы і аформіць “догляд за блізкай асобай”. Датуль я нават не падазравала, што як толькі чалавек

ПрайдзіСвет

робіцца залежным ад сацыяльнай дапамогі, многія чыноўнікі аўтаматычна ўключаюць яго ў катэгорыю марнатраўцаў і адпаведна з ім абыходзяцца. Праз гэта я пачувалася неверагодна прыніжанай.

Знаходжанне дома было суцэльным стрэсам. Я не магла адысці ад Вітэка, мерала яму тэмпературу разоў па дваццаць на дзень. Я ведала, што ўскладненні могуць настаць калі заўгодна, і на мяне наганялі жах тыя сто пяцьдзесят кіламетраў, якія нас аддзялялі ад шпіталя.

***Кастрычнік 2003***

Пасля месяца лячэння насталі першыя сур’ёзныя ўскладненні, звязаныя з нястачай белых крывяных цельцаў. Вітэк падхапіў сепсіс. Інфекцыя справакавала ўзмацненне ўсіх астатніх праблемаў. Пасля далейшага лячэння ён зусім перастаў хадзіць. Не мог утрымаць у руцэ ані лыжку. Але найгоршай была змена ў паводзінах. Ён упаў у апатыю, перастаў гаварыць і выдаваў толькі гукі прыблізна на актаву вышэйшыя за ягоны звычайны тон. Хоць ён і справіўся з інфекцыяй, дадому я прывезла яго ляжачага. Я паклала яго на канапу, і ён цэлы дзень нязрушна глядзеў у столь. Уяўленне, што хіміятэрапію ён лёгка перанясе, канчаткова знікла. Яшчэ ў шпіталі ён атрымаў псіхафармакі, якія, на шчасце, хутка пачалі дзейнічаць. Я дала яму плюшавага мядзведзя, а таксама сапраўдныя іголкі і шпрыцы. Ён браў у яго на аналіз кроў, стэрнальныя і люмбальныя пункцыі, відавочна, перажыўшы з яго дапамогай свае траўмы пасля балючых аперацый. Праз нейкі час ён зноў пачаў гаварыць, але мінула яшчэ нямала часу, пакуль ягоны голас вярнуўся ў сваю нармальную танальнасць. З дактарамі і медсёстрамі ён не хоча размаўляць да сёння.

***Лістапад 2003***

Двухмесячнага цыклу, калі Вітэк мусіў атрымліваць наступны лек – метатрэксат, – я баялася. Я ведала, што пасля іх у дзяцей у роце бываюць балючыя афты, і з гэтай прычыны ім нярэдка даюць апіяты. Афты падступна з’явіліся праз некалькі дзён пасля інфузіі. Горш за ўсё было пасля першай дозы, у Вітэка аблупілася ўся слізніца ў роце. На дзіва, яму гэта асабліва не балела. Прыгадваю, як ён сядзеў у кухні за сталом, задаволена жаваў булку, а кроў з рота капала яму на жывот. Потым я зрабіла страшэннае глупства. Тады ў яго былі афты і на вуснах. Мы паехалі ў шпіталь на агляд, і я, баючыся, каб ён нічым не заразіўся, надзела яму ў машыне хуткай дапамогі марлевую павязку. Калі потым я хацела яе зняць, то разам з павязкай зняліся і вусны.

prajdzisvet.org

У сітуацыі, калі захворвае такое маленькае дзіця, ёсць адзін добры момант, а менавіта, што яно сваю хваробу не ўсведамляе. Калі яму блага, дык яно паводзіцца як хворы, а калі добра – то як нармальны здаровы чалавек. Падчас адной інфузіі Вітэк мне як нічога ніякага сваім шапялявым голасам паведаміў, што ён “рады, што ў яго няма ніякай страшнай хваробы”. Дзеля пэўнасці я спытала, як ён сабе ўяўляе страшную хваробу. Ён скрывіўся, маўляў, што ж ты такая дурніца, і адказаў, што тады б у яго “з галавы цякла кроў”.

Хіміятэрапію яму рабілі не толькі праз вену, але і ў спіннамазгавую вадкасць. Праз ускладненні пасля некалькіх пункцый ён мусіў доўга ляжаць на жываце. Аднак утрымаць такое малое дзіця на жываце – праблематычна. Часта ён мусіў такім чынам ляжаць цэлы тыдзень, а пасля апошняй пункцыі – амаль 18 дзён. Муж паставіў перад ляжачым Вітэкам кампутар, падклаў яму пад грудзі падушачку, і Вітэк мог нацешыцца з так адмаўляных яму датуль кампутарных гульняў. Ён выпеставаў у сябе дасканалую залежнасць ад кампутараў.

У снежні дактары нам паведамілі, што на апошнюю фазу лячэння ёсць два варыянты, карацейшы або даўжэйшы, але абодвух для выздараўлення мусіла хапіць. Мы выбралі даўжэйшы варыянт. Цяпер я за гэта ўдзячная, хоць і ведаю, што гэта толькі пытанне псіхалогіі. Калі мяне ахоплівае страх, што лейкемія да Вітэка вернецца, я суцяшаю сябе тым, што ў яго было даўжэйшае лячэнне. Натуральна, я ведаю, што напэўна не вядома, які варыянт для дзіцяці лепшы, але ў такой сітуацыі рацыянальна разважаць цяжка.

***Студзень 2004***

Зала гама-тэрапіі Вітэку спадабалася. Да яе выдатна пасавала мая выдумка пра касмічную трэніроўку. Гэта быў трэнажор для старту ракеты. Вітэк мусіў ляжаць, паклаўшы твар у пластыкавую маску, прымацаваную да падстаўкі. Апраменьванне доўжылася прыблізна хвіліну, і ён пераносіў яго цудоўна. Потым дома ён плакаў, што хоча ездзіць на “гама-тылапію”. Пасля апраменьвання ў яго павыпадаў апошні пушок, што заставаўся на галаве. Упершыню ў яго быў той сапраўдны бліскучы плех. Я думала, што валасы ў яго ўжо ніколі не вырастуць.

Потым прыйшлі два месяцы, калі ён прымаў цытастатыкі толькі ў таблетках, а на агляд мы ездзілі раз на тыдзень. Гэта былі цудоўныя

“хімічныя вакацыі”. На той час я мела за плячыма некалькі сутычак з нашай сістэмай аховы здароўя. У мяне выйшаў канфлікт са страхавой кампаніяй. Колькі разоў мне адмаўляліся кампенсаваць выдаткі, на што мы мелі права, і абгрунтоўвалі гэта, напрыклад, тым, што на адным з маіх бланкаў запісы зробленыя рознымі почыркамі. Я мусіла спрачацца і спасылацца на вышэйшыя інстанцыі. Хоць закон характарызуе лейкемію як “80-працэнтную ступень парушэння здароўя”, мне спрабавалі намовіць, што “інспектар, хутчэй за ўсё, нам гэтага не прызнае”. Урэшце гэты самы страшны інспектар выявіўся найменшай праблемай. Не змігнуўшы вокам, ён прызнаў нам усё без выключэння.

Былі перыяды, калі праз неабходнасць даплачваць за медыкаменты мы траплялі ў фінансавую яму. Гэта былі дробязі, але яны хутка нагрувашчваліся адна на адну. Растворы на паласканне рота, антыбіётыкі, мінералы і вітаміны, прызначаныя дактарамі, марлевыя павязкі і шпрыцы для сіропаў. Гэта я яшчэ магла зразумець. Але калі я даведалася, што мы мусім даплачваць таксама за цытастатык, які немагчыма было замяніць нічым, я страшэнна раз’юшылася. Тут справа была ўжо не ў лішняй сотні, а ў прынцыпе. Міністарка публічна сцвярджала, што кожнаму леку ёсць замена, якая можа быць цалкам кампенсаваная страхавой кампаніяй, але гэта была няпраўда. Я б не была супраць аплачваць утрыманне ў шпіталі, бо я ж і дома жыву і харчуюся не задарма. Гэта мне здаецца больш прымальным, чым бясплатна карміцца і ў выніку даплачваць за неабходнае лячэнне.

***Травень 2004***

Пачынаць апошні цыкл лячэння мне зусім не хацелася. Вітэк зноў мусіў прымаць картыкоіды, таму шчокі, якія ў яго тым часам схуднелі, зноў імкліва нараслі. У яго праяўляліся ўскладненні самага рознага тыпу. Раз гэта быў сепсіс, іншым разам віроз, потым нейрапатыя або дрэнныя паказнікі аналізу крыві. Вітэк меў за плячыма некалькі пераліванняў, і ягонае цела пасля года лячэння было вычарпанае. Знаходжанне ў шпіталі зацягвалася, і кожнага разу знаходзіліся падставы, каб адкласці хіміятэрапію. У выніку працяглай шпіталізацыі Вітэка запаланілі калоніі бактэрый, устойлівых супраць антыбіётыкаў, таму і я з палаты магла выйсці толькі ў халаце, марлевай павязцы і рукавіцах. Я сядзела на ложку, пазірала на супрацьлеглую сцяну, з якой тырчаў нейкі шруб, і часам пачынала верыць, што адсюль мы ўжо не выберамся. Раніцу, калі Вітэк атрымаў апошнюю дозу хіміятэрапіі, я буду памятаць усё жыццё.

***Мястэчка***

У жніўні пасля кароткага перапынку ў Вітэка распачаўся рэабілітацыйны цыкл, які мусіў працягнуцца яшчэ прыблізна год. Цытастатыкі ён атрымліваў у таблетках, а на агляды мы ездзілі штотрытыдні. Значна вальнейшым зрабіўся наш хатні рэжым. Вітэка ўжо не трэба было так пільна ахоўваць ад інфекцыі. Праз год да нас змаглі прыйсці ў госці знаёмыя, мы ўжо не мусілі так баяцца выбрацца з дому. За той час мы зазналі нямала рэакцый на Вітэкаву хваробу. Некаторыя людзі нас пачалі пазбягаць, бо не ведалі, што сказаць. Іншыя былі салідарныя, а некаторыя праяўлялі сваю дурноту. Дагэтуль памятаю дзвюх жанчын. Адна пыталася, чаму Вітэк яшчэ не памёр, а другая – ці лейкемія заразная. Гэтага я ўжо не вынесла і на поўным сур’ёзе адказала, што так, натуральна, і цягам двух тыдняў усё мястэчка вымра.

***Жнівень 2005***

Год мінуў. У Вітэка адраслі валасы, сплюшчыліся шчокі і жывот. Ён вярнуўся да свайго адпачатнага выгляду. Пасля таго, як ён зусім не мог стаць на ногі, цяпер ён ужо можа бегаць і катацца на ровары. А тое, што ў яго трохі нязграбная паходка? Халера з ёй! Тым не менш я ведаю, што справа яшчэ не выйграная. Лейкемія можа вярнуцца і яе лячэнне ўжо зусім не мусіць быць такім паспяховым. Напярэдадні аглядаў я ад страху не магу спаць. У мяне бывае адчуванне, што зноў я б гэтага не перажыла. Але мне ўсё адно не засталося б нічога іншага, як праз гэтае пекла чарговым разам прайсці. Дзякуючы Вітэкавай хіміятэрапіі я ўпэўнілася, што чалавек можа вытрываць значна больш, чым сам можа сабе ўявіць.

Мне яшчэ застаецца датрымаць абяцанне пра палёт на ракеце, якое я дала сыну перад пачаткам лячэння. На шчасце, мне ўдалося яго пераканаць, што самалёт лепшы, чым ракета. Таму калі вы на аэрадроме ўбачыце маленькага хлопчыка ў жоўтым камбінезоне і ў касцы, не здзіўляйцеся. Яго завуць Вітэк і ён змагаецца з лейкеміяй.

***узрост* 26 гадоў | *рост* 168 см | *вага* 47 кг**

Гэта былі два гады пекла, дый Міхал пачынаў нецярплівец. Ён дакараў мяне, што я занадта занятая хворым дзіцём, што я ад яго, Міхала, аддалілася, не цікаўлюся ім. Я прасіла яго, каб ён пачакаў пару месяцаў, перш чым мы канчаткова скончым хіміятэрапію. І менавіта ў той час зноў усплылі мае

праблемы з ежай. Я была ў стрэсе, мне не хацелася есці, хадзіць некуды на абеды. Я іх прапускала. Я адчувала, што ў маім жыцці адбываецца нешта, што не паддаецца кантролю. Я ніяк не магла паўплываць на хваробу свайго дзіцяці, я не магла паўплываць на тое, выжыве яно ці памрэ. І нешта адбывалася з Міхалам. Я была збянтэжаная. Я адчувала, што страчваю яго, і я не здолела гэтага папярэдзіць. Паціху падкралася ўжо добра вядомае мне адчуванне, што жаданне есці падпарадкоўваецца маёй моцы. Гэтае жаданне я магла кантраляваць і кіраваць ім. Гэта пачало нарастаць, паралельна з тым, як я адчула, што ў Міхалава жыццё ўвайшоў нехта яшчэ.

Дзень, калі маё падазрэнне канчаткова пацвердзілася, быў днём, калі я *насамрэч* перастала есці. Момантам, калі я дала голаду сваю поўную ўнутраную згоду. Імгненнем, у якое я абсалютна ясна ўсвядоміла, што голад – гэта адзінае, што мне засталося і што здольнае мяне падтрымаць, напоўніць і задаволіць. Мне здавалася, што я страціла самае важнае ў сваім жыцці. Я адчувала, што сваё жыццё я мушу зноў неяк ухапіць, апанаваць яго. Ужо не было ніякай пэўнасці, ніякіх кропак апоры. Я была аддадзеная на волю таму, ці маё дзіця выжыве або памрэ, ці мой муж падтрымае мяне ў цяжкой жыццёвай сітуацыі, у якой я апынулася пасля родаў, або ці Міхал сыдзе да іншай жанчыны. Адзінай пэўнасцю быў кантроль вагі. Механізм, які дзейнічаў. І я пачала худнець. Я не ведала, што тое, што ўва мне пачынае развівацца, называецца ментальнай анарэксіяй.

## Пад паверхняй

---

***узрост* 27 гадоў | *рост* 168 см | *вага* 45 кг**

Больш за год я худнела. Атачэнне раз-пораз казала, што гэта ўжо занадта, але сама я гэтага дапусціць не хацела. Пакуль мая сяброўка не пачала заводзіць – хутчэй праз свае здагадкі, упэўненай яна не была – размовы пра анарэксію. Я не хацела гэтага прызнаваць. Я адпрэчвала гэта нават перад самой сабой. На людзях я дэманстратыўна ела, вядома, толькі нізкакаларыйныя прадукты, удавала, як мне ежа прыносіць радасць, але ўрэшце я пачала ўдаваць і тое, што я ем. А на самоце я галадала. Я жыла фактычна толькі на каве з малаком.

Грала я пераканаўча. Я магла сядзець за сталом з сям’ёй, з цэлай порцыі з’есці два зернейкі рысу, і тым не менш ніхто нічога не заўважаў. Ежу я звычайна размазвала відэльцам па талерцы і ўдавала, што ем паволі, а калі ўсе ўставалі з-за стала, я сваю порцыю выкідала. Заспакаенне ад голаду была

моцным. Гэта быў наркотык. Ежа, ці хутчэй яе непрыманне, сталася ў маім жыцці тым адзіным, у чым я выразна бачыла вынік і ўзаемасувязі. Галаданне ўвесь час давала новыя прыемныя адчуванні. Адчуванні чысціні, эксклюзіўнасці, паспяховасці. Калі я не ела, мне здавалася, што я моцная і з усім змагу даць сабе рады. Бо калі я не ем, я чыстая, прыгожая, дасканалая, паспяховая і ў мяне ўсё выходзіць. Калі ж я хоць трошкі ела, у мяне адразу з’яўлялася пачуццё татальнай паразы. Я ўнутрана панікавала, была сама сабе агіднай і бруднай.

Гэтаксама як хвароба майго дзіцяці, так і стасунак з Міхалам, які падтрымліваў мяне пры жыцці, раптам абрынуў мяне ў бездань, якая не паддавалася ўплыву і кантролю. Абрынуў у катэгорыю рэчаў, якія не маюць амаль ніякай лагічнай повязі паміж тым, што я раблю, і тым, што з гэтага вынікае. Я зазнавала невыносна моцную прагу ягонай блізкасці і кахання, таго, каб мы былі разам, як і раней. Я прагнула яго не толькі як каханка, але і як бацьку, маці, сябра. З ім я дарэшты страчвала саму сябе. Усю сваю ідэнтычнасць я выбудавала на ім. Дзеля яго я дыхала, дзеля яго я старалася быць прыгожай. Ён вызначаў увесь мой светапогляд, мае каштоўнасці, маю ўласную вартасць. Я не здолела замірыцца са стратай ягонай блізкасці. Знікла падстава сілкаваць сваё цела. Паступова знікала жаданне жыць і ў меру таго знікала жаданне есці.

З цягам часу голад узяў на сябе і шэраг іншых функцый і значэнняў. Але гэта не было вынікам рацыянальнага рашэння, як, магчыма, магло б здавацца. Нельга сказаць, што аднойчы я ўбіла сабе ў галаву: хачу памерці, а таму галаданнем давяду сябе да смерці. Порцыі змяншаюцца пакрысе, як бы крадком, чалавеку добра, ён не прыкмячае нічога дрэннага. Нарэшце цела пачынае жыць так, як жыве і душа. Для мяне важным было адчуванне, што *так* маё жыццё сталася праўдзівым. Паесці значыла ўвайсці ў ману, зрабіць нешта, што няпраўдзіва. Ніхто не хоча ісці супраць таго, што лічыць правільным. І калі я гэтага свайго адчування не слухалася, я правальвалася ў хаос і мяне апаноўвалі згрызоты сумлення. Трэба сказаць, што пачуццё віны ніколі мяне дарэшты не пакідала. Напачатку мама правакавала згрызоты за тое, які ў мяне характар, якая я ёсць. Пазней я адчувала згрызоты за інтымнасці з Міхалам. Урэшце, калі я даведалася, што Міхал закахаўся ў іншую жанчыну, я абвінавачвала сябе, што я кахала яго недастаткова, не прысвячала яму сябе настолькі, як мусіла б.

Прайшло яшчэ некалькі тыдняў, і я цалкам перастала адчуваць голад. Засталася толькі эйфарыя. Голад зрабіўся асобай – сябрам, які суцяшаў. Я

зрабілася ад яго залежнай. Я б сказала, што гэта падобна да залежнасці ад алкаголю. Адно што тут функцыю “наркотыку” ўзяў на сябе голад. Ён быў адзіным, што ў мяне было. Ён быў маім дасягненнем. У мяне была магчымасць увесь час імкнуцца да дасканаласці, якая палягала ў схудненні. Я мела сілы кіраваць гэтым. Я не адчувала болю, не адчувала нічога. Мяне падганяла адзіная думка – важыць сёння хоць на пару дзесяткаў грам менш, чым учора. Я нікому не расказвала пра механізм, які функцыянаваў у маёй галаве. Голад быў таямніцай, якая мяне ўмацоўвала, якая дапамагала мне вынесці ўсе праблемы. І я баялася, што калі пра гэтую таямніцу даведаюцца іншыя, яны захочуць у мяне яе забраць, і тады я страчу сваю дасканаласць і магчымасць кантролю. Было б памылкаю думаць, што гаворка ідзе пра вонкавы выгляд і прыгажосць. Гаворка пра ўнутранае задавальненне ад дасягнутага. Збыткоўную вагу я ўважала за паразу. У мяне было адчуванне, што, набраўшы вагу, я выстаўлю напаказ усе свае хібы і віны. Погляд на мізэрнае цела мяне супакойваў, дадаваў мне пачуцця пэўнасці і радасці. Паступова я страціла рэальную візію таго, як выглядаю. Мне ўвесь час здавалася, што ў мяне вельмі выступае жывот і ў мяне даслоўна “мегасцёгны”. Я была перакананая, што мне па-ранейшаму ёсць што скідаць і чаго дасягаць. Мяне перастала турбаваць, што ў мяне зніклі грудзі. Я бачыла, што адзенне на мне вісіць, але мне было ўсё роўна.

Голад дзейнічаў і як узнагарода, і як кара. Калі я з нечым спраўлялася, я зацвярджала поспех галадам, і толькі тады ён быў дасканалы. Калі ж у мяне нешта не выходзіла, галадам я сябе карала. Шматкроць мяне падтрымлівала адчуванне, што калі нічога не выходзіць, дык прынамсі галаданне – так.

Голад фармаваў маю свядомасць, вызначаў, хто я, ён быў маёй ідэнтычнасцю. А знішчыць сваю ідэнтычнасць нікому не хочацца. Я баялася, што калі пачну есці, страчу арыенцір у жыцці, перастану ведаць, хто я. Голад вызначаў і дэфінаваў маё *я*. А ад гэтага я адмовіцца не хацела. Думаю, што ў гэтым палягае падступнае ўключэнне волі, якая пачынае анарэксіі спрыяць. Бо ніхто ж не хоча адмовіцца ад самога сябе і сваёй пэўнасці.

Аднак чым далей, тым часцей я апыналася ў стане цялеснай вычарпанасці. Былі моманты, калі ў мяне падломваліся калені, у мяне страшэнна балелі цягліцы, я прачыналася ад задухі, у мяне пачасціліся сутаргі, моцна калацілася сэрца. Мне здавалася, што я не змагу нічога зрабіць. Я прагнула толькі заснуць і спаць. Я пераставала рухацца, неяк падсвядома ашчаджала кожную кроплю энергіі, я ўжо нікуды не хадзіла. Псіхічна мяне нішчыла разуменне, што я ўжо няздольная жыць паўнавартасным жыццём. Я баялася, што губляю свае творчыя здольнасці, што вось-вось страчу здольнасць думаць і не змагу ўжо засяродзіцца на

працы. Я была раздражнёная, непрыемная, крычала на дзяцей. Далей падзеі развіваліся паводле аднаго з двух магчымых варыянтаў. Або я вырашала, што зноў пачну есці і спрабавала гэта зрабіць. Як правіла, паеўшы раз або два, я пачынала мець такія згрызоты сумлення, што зноў пераставала есці і пачынала галадаць яшчэ больш гарліва. Другім варыянтам быў той, што цела зноў прывыкала да голаду і вычарпанасць мінала. Прыйшоў перыяд, калі я пачувалася моцнай, я была неверагодна вітальная і творчая. Пазней тыя адчуванні інтэнсіўна матывавалі мяне да далейшага галадання. Я зазнавала перамогу над самой сабой.

---

***узрост* 28 гадоў | *рост* 168 см | *вага* 43 кг**

Нягледзячы на ўсё тое, што я пра Міхала даведалася, я не здолела яго пакінуць. Я належала да яго. І ён таксама не хацеў скончыць наш стасунак. Ён прасіў прабачэння і тлумачыў мне, чаму ўсё так здарылася. І галоўнае – пералічваў прычыны, чаму я з ім мушу застацца. І я не здолела сысці. Пра анарэксію ён даведаўся года праз паўтара. Ён быў у шоку. Часам ён намякаў на тое, што я худая, але я спасылалася на стрэс. Я не адчувала сілы прызнацца. Голад быў маёй зброяй супраць болю, які ён мне прычыняў сваёю нявернасцю. Я не магла яму пра гэта сказаць, мне б тады не засталося ніводнага сродку для ўратавання сябе. Ён не здолеў гэтага зразумець і вінаваціў мяне, што я так доўга не прызнавалася яму. Ён пачаў мне абяцаць, што зробіць усё дзеля таго, каб я была шчаслівая і каб я паправілася. Аднак самае падставовае ў маім жыцці – няпэўнасць у стасунку з ім – ніяк не змянілася. Ён па-ранейшаму ўтрымліваў кантакт з той жанчынай і пераконваў мяне, што яны толькі сябры. Але я адчувала, што сэрцам ён не са мной, і я галадала душой і целам. Я ненавідзела сама сябе за тое, што не здолела даць яму дастаткова, каб утрымаць побач. Мяне не пакідалі думкі пра супярэчнасць паміж тым, што ён услых казаў – як кахае мяне і як мы належым адно аднаму, – і фактам, што сэрцам ён недзе ў іншым месцы. Хоць я і пачала хадзіць на псіхатэрапію, куды ён мяне суправаджаў, але свой голад, пэўнасць я і надалей старанна ахоўвала.

Мой стан хутка пагаршаўся, аднак я гэтага не ўсведамляла. Я жадала толькі сваёй худзізны і адчуванняў, якія з гэтым былі звязаныя. Неўзабаве пасля Новага года я захварэла на грып, які выліўся ў цяжкую інфекцыю. Высокая тэмпература не збівалася і мяне забралі ў шпіталь.

Хоць у мяне і была замалая вага, я ні ў чым не прызналася. Калі доктар мяне спытаў, ці я за апошні час не схуднела, я сказала, што такая вага ў мяне ўжо 10 гадоў. Гэта была падступная сітуацыя. Калі б я была

шаснаццацігадовай дзяўчынай, пры маёй худзізне кожнаму закралася б падазрэнне. А так перад імі была маці дваіх дзяцей, і анарэксія не прыходзіла пад увагу. У шпіталі было жахліва. Я ненавідзела дактароў і медсёстраў за тое, што яны мяне штодня праглядалі, што я перад імі мусіла агаляцца. Я не хацела, каб яны бачылі, як я выглядаю, я вельмі саромелася. Антыбіётыкі не дапамагалі і тады да мяне дайшло, што ўсё і напраўду дрэнна. Я думала, што памру. Нейкі час я баялася, але потым ад страху засталася толькі відзежа, быццам я вельмі павольна падаю спінай у ваду  і яна нада мной сыходзіцца. Страх мяне пакінуў. Смерць мне бачылася вызваленнем. Я ўсё больш фізічна цярпела ад наступстваў галадання і адначасова з гэтым я не магла пераадолець пачуцця віны, калі дазваляла сабе паесці. Пачуцця, што я тоўстая, што па мне відаць мае паразы, мая віна, мая недасканаласць. Смерць я ўспрымала як вызваленне ад катання на той каруселі. Яна была для мяне нечым прыгожым. Адзінае, што мяне ўтрымлівала ад таго, каб скончыць жыццё самагубствам, было пачуццё адказнасці за дзяцей. Гэта можа гучаць парадаксальна. Аб’ектыўна я забівала сябе голадам. Але ж гэтае забіванне голадам было непрыкметным, схаваным, павольным. А адчуванні, якія голад мне прыносіў, заціралі ўсведамленне, што адмовай ад ежы я сабе шкоджу. Я хацела жыць, але мне здавалася, што я не здолею жыць з анарэксіяй, бо сіл заставалася ўжо вобмаль, і ў той жа час – што я не здолею жыць без яе. Я была загнаная ў кут, з якога ўжо немагчыма было выбрацца. Голад мяне татальна апанаваў. Ён урастаў у маю асобу, пакуль я не пачала яго ўспрымаць так, што я і ёсць анарэксія. *Я – голад*. Пачаць лячыцца ад анарэксіі, забіць анарэксію для мяне значыла забіць саму сябе. Ніякія рацыянальныя аргументы не дзейнічалі, усё адбывалася абсалютна па-за маёй воляй. Не дзейнічала пераконванне псіхолага, што гэта не маё сапраўднае я. Я шукала паразумення, але мне не было каму даверыцца. Гэта мяне прывяло на *блогі за-ана*. Але мяне не цікавілі *за-ана* пятнаццацігадовых дзяўчатак, якія пераказваюць адна адной інструкцыі, як худнець, і плачуцца над сваімі тоўстымі сцёгнамі. Я шукала *за-ана,* у якіх гаворка ішла пра душэўныя станы і жыццё з *ана*. Я шукала маладых жанчын, якія *ана* адчувалі гэтаксама як я. Аднойчы на інтэрнэце я адшукала ролік, у якім чаргаваліся фотаздымкі такіх дзяўчат. Пад здымкамі было напісана, калі і як яны ад анарэксіі памерлі. Тых дзяўчат я ўспрымала як блізкіх сябровак. Я глядзела на іх цэлыя гадзіны. Яны былі як анёлы – чыстыя, прыгожыя, вызваленыя.

Наступным парадоксам было тое, што ў маёй галаве абсалютна ўсё пераключалася на анарэксію. Хоць я і бачыла ролікі, якія падкрэслівалі яе падступнасць і небяспеку, мая думка заўсёды прачытвала гэта аднолькава: анарэксія чароўная! Гэта адзіны магчымы шлях, як сапраўды паўнавартасна жыць, гэта напоўненасць. Вядома, я не хацела выглядаць дрэнна, але не

існавала месца, з якога б я бачыла, што я такая худая. А пакінуць *ана* я не жадала.

Калі людзі, якія не ў тэме, сцвярджаюць, што ўсім можна кіраваць з дапамогай волі, то яны зусім нічога не разумеюць. Анарэксія глыбейшая за волю. Гэта яна вызначае, што чалавек будзе хацець. Я часта размаўляла з *ана*, прасіла яе аб дапамозе. Яна сталася для мяне богам. Так, як людзі моляцца да Бога, так я малілася да анарэксіі. “*Ana*, make me better!” – шаптала я ёй да бясконцасці.

<…>

*пераклад з чэшскай* – Сяргей Сматрычэнка

© Petra Dvořáková, 2010
© Сяргей Сматрычэнка, пераклад, 2010